Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Сіцькоўская дзіцячы сад - сярэдняя школа”
Міёрскі раён, Віцебская вобласць

# Праз вайну, праз памяць, праз лёсы...

**(даследчая праца)**

**Выканаўцы**: *Шульга Алена Аляксандраўна,10 клас*
*Шыпіла Анастасія Іосіфаўна, 10клас*
*Шупенька Ганна Пятроўна, 10 клас*
*Кубліцкая Таццяна Фёдараўна, 10 клас*

**Кіраўнік**: *Шымуковіч Раіса Аляксандраўна,*
*настаўніца гісторыі,*
*І кваліфікацыйная катэгорыя*

**2014**

**Анатацыя**

У гэтым годзе мы будзем адзначаць знамянальную дату – 70-годдзе Вялікай Перамогі. Доўгім і цяжкім быў шлях у пераможны май сорак пятага года. Наша краіна страціла тысячы сыноў і дачок. Увесь народ падняўся на барацьбу з ворагам. У ваколіцах вёскі Сіцькова і суседніх вёсках таксама разгарнулася барацьба. Нашы землякі змагаліся на франтах, у партызанах, здабывалі каштоўныя звесткі, ахвяравалі жыццём дзеля Перамогі. Сярод нашых землякоў не было Герояў Савецкага Саюза, не адбывалася вялікіх вырашальных бітваў, але нашы землякі не былі пасіўнымі назіральнікамі ваенных падзей. Мы лічым, што усе, хто перажыў вайну і змагаўся, Героі. Варта памятаць іх імёны, шанаваць іх памяць, дапамагаць тым, хто яшчэ побач з намі. У сваёй працы мы стараліся прайсціся дарогамі вайны аднавяскоўцаў, тых, хто ваяваў на фронце, змагаўся ў партызанах, у тыле, хто цярпеў у канцлагеры. Расказаць пра ўсіх немагчыма, мы прасачылі лёсы некаторых. Большасці ўдзельнікаў тых драматычных падзей няма ў жывых. Са слязамі на вачах дзяліўся ўспамінамі Белазорчык М.Р. Успаміны некаторых ветэранаў і ўдзельнікаў вайны захоўваліся ў школьным музеі і былі цяпер дапоўнены іх дзецьмі – Мішутам М.І., Федарцом М.М., Глінскім П.С., Скавародка Г.Ю., Чарняўскім П. М. Дапамогу ў зборы звестак аказалі суседзі і сваякі ветэранаў. Дакументы і ўзнагароды Вялікай Айчыннай вайны свята захоўваюцца ў сем’ях, чые блізкія змагаліся ў час вайны. Так не згасае памяць пра вайну.

Час няўмольны. Пакідаюць нас ветэраны, непасрэдныя сведкі тых падзей, губляюцца дакументы, забываюцца факты. Таму так важна паспець сабраць, захаваць тое, што яшчэ не страчана. Захаваць памяць, што мы і пастараліся зрабіць у сваёй працы. Памяць пра падзеі таго часу не проста даніна павагі, бязмежная падзяка героям, глыбокая пашана да ветэранаў той жахлівай вайны, да ўсіх, хто як мог набліжаў перамогу над ворагам. Памяць кожнага з нас робіць тое месца, дзе ты нарадзіўся, роднай старонкай. Той старонкай, за якую змагаліся нашы суайчыннікі.

План

1.Уводзіны

2. Праз вайну, праз памяць, праз лёсы…
   1.1. Землякі на франтах Вялікай Айчыннай вайны
   1.2. Удзельнікі партызанскага руху
   1.3. Жанчына на вайне
   1.4. Вечная слава героям!
   1.5. На працоўным фронце
   1.6. Вязні канцлагера
   1.7. З успамінаў мясцовых жыхароў

3. Заключэнне
4. Выкарыстаныя крыніцы

## Уводзіны

Народ беларускі, радзіме аддany,
Прайшоў гераічны, праслаўлены шлях –
Сябе ён адзначыў і працай стараннай,
І гордым бясстрашшам у грозных баях.

Дзевятага мая Беларусь адзначае Дзень Перамогі над фашысцкай Германіяй. І сёння таксама, як у сорак пятым, гэты дзень застаецца святочным і трагічным. Кожны народ мае свае святыні, што выклікаюць гонар і павагу ўсё новых і новых пакаленняў. Нашай безумоўнай святыняй была і застаецца памяць пра подзвіг народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Ніколі не знікне з памяці народа гордасць за Вялікую Перамогу і памяць пра тую вялікую цану, якую мы заплацілі. Амаль кожную беларускую сям'ю закранула гора, якое несла з сабою Вялікая Айчынная вайна.

Памяць вайны… Гэта боль перажытага народам за доўгія 1418 дзён. Гэта страты і ахвяры, гераічная барацьба не на жыццё, а на смерць, цяжкія дарогі выпрабаванняў. У сваёй працы мы пастараліся прасачыць, дзе сустракалі нашы землякі Дзень Перамогі, прайсціся па ваенных дарогах і сцежках нашых землякоў. Дзе толькі яны не змагаліся! Куды толькі не кідаў іх жорсткі ваенны лёс. І якім доўгім быў шлях да сорак пятага!

У цяжкі час беларускія людзі прадэманстравалі свае лепшыя чалавечыя якасці – годнасць, высакароднасць, гатоўнасць самаадданa бараніць родную зямлю, яны змаглі захаваць маральнае адзінства, веру ў вызваленне. Гэта дало магчымасць у кароткі тэрмін разгарнуць на акупіраванай тэрыторыі магутнае супраціўленне. Роўнага яму не было ў краінах Еўропы. Гэта супраціўленне ўключала ў сябе ўзброеную барацьбу партызан і падпольшчыкаў, усямерную падтрымку патрыётаў з боку насельніцтва, барацьбу дзеючай арміі і працоўнага фронту. Старыя і малыя, мужчыны і жанчыны, дзеці – усе сталі на барацьбу з ворагам. У кожным куточку Беларусі вялася жорсткая барацьба. Нашы землякі таксама вялі барацьбу з ворагам у акрузе вёскі Сіцькова і далёка за межамі Беларусі. Гэта можна прасачыць па геаграфічнай карце Еўразіі. На жаль, ветэранаў з кожным годам застаецца ўсё менш і менш. Мы выкарысталі ўспаміны саміх ветэранаў і вязняў, а таксама іх сваякоў, блізкіх, сяброў. Выкарысталі публікацыі розных гадоў раённай газеты і матэрыялы школьнага музея.

Падрастаючае пакаленне павінна ведаць, які цяжкі і доўгі шлях вытрымалі нашы продкі, каб здабыць для нас Перамогу! Пройдземся сёння гэтымі дарогамі, якія нам нельга забыць, каб глыбей адчуць шчасце заваяванага міру і радасць Перамогі! Хай жывуць у памяці старонкі слаўнага мінулага.

# 1. Праз вайну, праз памяць, праз лёсы…
## 1.1. Землякі на франтах Вялікай Айчыннай вайны

Каго зямлёй на фронце засыпала,
Вяртаўся хто з таго на гэты свет,
Той не забудзе, колькі каштавала
Вайна крыві і непапраўных бед.
П. Панчанка

### Фёдар Іванавіч Бяляеў

У 1943 годзе Фёдар Іванавіч трапіў на І-ы Беларускі фронт у 713 пяхотны полк. *Першы Беларускі фронт быў створаны ў выніку перайменавання Беларускага фронту ў лютым 1944 г. Дзейнічаў на Бабруйскім і Брэсцка-Люблінскім напрамках. Камандуючыя Маршалы Савецкага Саюза К.К.Ракасоўскі, з лістапада 1944 г. – Г.К.Жукаў. Войскі фронту сваімі сіламі і разам з іншымі франтамі ў ходзе Беларускай аперацыі 1944 правялі Рагачоўска-Жлобінскую, Бабруйскую, Мінскую, Люблін-Брэсцкую, у 1945 - Вісла-Одэрскую, Усх.- Памеранскую, Берлінскую аперацыі*. [7, с.460]. *З 14 студзеня па 3 лютага 1945 года, у ходзе Вісла-Одэрскай стратэгічнай аперацыі, правялі Варшаўска-Познанскую аперацыю і, вызваліўшы цэнтральную частку Польшчы з Варшавай, выйшлі на Одэр, захапіўшы на левым беразе ракі плацдарм* [8].

Камандзір навучыў страляць з аўтамата, кідаць гранаты. Гэта асноўная зброя пехацінца. Чакаць першага бою доўга не давялося. Усё было, як у сне. Бег, падымаўся, выпускаў бясконцыя чэргі. Пасля з Латвіі часці перакінулі на Одэр. Прымаў удзел у фарсіраванні нямецкай ракі Одэр. Было дадзена заданне расшырыць плацдарм для наступлення. Тут патрабаваліся смелыя, мужныя салдаты, якія б змаглі ўклініцца ў варожую абарону, захапіць тэрыторыю на другім беразе ракі і трымаць яе да наступлення нашых войск. Хоць і панеслі значныя страты, але заданне выканалі.

Да Берліна Фёдар Іванавіч не дайшоў прыкладна пятнаццаць кіламетраў. Яго цяжка параніла, атрымаў кантузію. Лячыўся ў шпіталях у Германіі, Польшчы, Уфе, дзе і сустрэў Дзень Перамогі. Вярнуўся ў родную вёску ў 1946 годзе. На грудзях – ордэн Славы ІІІ ступені, медаль “За перамогу над Германіяй” і іншыя ўзнагароды.

### Скавародка Юрый Міхайлавіч

Юрый Міхайлавіч Скавародка не прымаў удзел у партызанскім руху на тэрыторыі Міёрскага раёна. Але пра жыццё партызан ведаў добра. У партызанах быў яго стрыечны брат (брыгада “Кастрычнік”), і Юрый часта збіраў якія-небудзь звесткі аб размяшчэнні нямецкіх войск або перамяшчэнні варожых частак.

4 ліпеня наш раён быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. 12 ліпеня 1944 года Юрыя таксама, як і многіх іншых, запрасілі ў ваенкамат, які быў размешчаны ў вёсцы Новы Пагост. Юнакоў 1927 года нараджэння на фронт не адправілі, а паслалі на курсы. Так хлопец апынуўся ў гарадскім

пасёлку Друя, дзе на працягу двух месяцаў праходзіў навучанне. Пасля заканчэння курсаў быў напраўлены ў атрад па барацьбе з бандытызмам. На вызваленай тэрыторыі засталося яшчэ многа паліцаяў, немцаў. Атрад дзейнічаў у многіх вёсках Міёрскага, Браслаўскага раёнаў, нават на тэрыторыі Латвіі.
Хутка аб'явілі пра прызыў у армію юнакоў 1927 года нараджэння. Так Юра аказаўся ў горадзе Шэксна Валагодскай вобласці, дзе прайшоў курсы "Маладога байца", пасля якіх яму было прысвоена званне малодшага сяржанта. Пасля курсаў юнака адправілі на фронт у размяшчэнне 377 дывізіі, якая дыслацыравалася ў горад Петразаводск. Дывізія ўваходзіла ў 70-ы асобны механізаваны полк. Яго задача: ліквідаваць нямецка-фінскія фашысцкія ўзброеныя групы і аднавіць граніцы паміж Карэла-Фінскай ССР і Фінляндыяй. Скавародка Юрый Міхайлавіч быў прызначаны намеснікам камандзіра 2-га ўзвода, які павінен быў ачысціць тэрыторыю населеных пунктаў Суаярві, Янісярава, Лісіпіда. 19 верасня 1944 года ўрад СССР заключыў перамір'е з Фінляндыяй, але выгнанне нямецкіх войск колькасцю каля 200 тысяч чалавек зацягнулася да 26 красавіка 1945 года. Заставалася многа ўзброеных груп ("кукушак"). Мясцовасць такая, што вельмі многа камяністых, скалістых узгоркаў, якія змяняюцца балоцістымі нізінамі. "Кукушкі" – гэта група з 4-5 чалавек, якія добра ўзброены. Яны могуць знаходзіцца ў засадзе на якім-небудзь участку дарогі. Выбіць такога ворага вельмі складана: у плен яны не здаваліся. Чырвонаармейцы пачыналі з нізіны, з балотца, часам у вадзе прыходзілася ляжаць па 4 гадзіны. Юрыю Міхайлавічу запомніўся бой за Лісіпіды. Там былі знішчаны 3 групы фінскіх фашыстаў. Адзін з іх быў прыкуты да дрэва і страляў з пулямёта да той пары, пакуль не скончыліся патроны. Аднойчы Юрый з салдатамі (усяго 12 чалавек) ехаў на заданне. Здавалася, што нічога не прадказвала бяды, таму што дарогу ўжо праверылі сапёры. Але… выбух. Гэта была супрацьтанкавая міна. Загінула чацвёра салдат, восем атрымалі раненні. Юрый апрытомнеў на чацвёртыя суткі ў шпіталі ў Архангельску, дзе прабыў чатыры з паловай месяцы і сустрэў **Дзень Перамогі**. Пасля выздараўлення прадоўжыў службу. Дэмабілізаваны ў ліпені 1949 года.

## 1.2. Удзельнікі партызанскага руху

Зайграй нам ізноў, партызанскі баян,
Як тады ў векапомныя годы,
Калі нашых братоў,
Баявых партызан,
Весяліў і вадзіў у паходы…

У. Дубоўка

Беларускую зямлю называюць краем партызанскай славы. Партызанскія брыгады і атрады ўсімі сіламі дапамагалі Чырвонай Арміі. Народныя мсціўцы сваімі актыўнымі дзеяннямі трымалі гітлераўцаў у пастаянным напружанні. Нечаканасцю свайго з'яўлення і кемлівасцю яны часта абяззбройвалі немцаў. Захопнікі былі вымушаны праводзіць супраць іх карныя аперацыі, ахоўваць кожны кіламетр чыгунак і шашэйных дарог, кожны аб'ект, які меў ваеннае

значэнне. На гэта адцягвалася вялікая колькасць ахоўных і вайсковых часцей. Немцы лютавалі, а партызаны прыбліжалі Перамогу.

**Глінскі Сцяпан Рыгоравіч**

Партызан 4-й Беларускай партызанскай (сазыкінскай) брыгады, атрад камандзіра Гарбаценкі. Радавы 139 палка НКУС.

У 1943 годзе пайшоў у партызаны. Працаваў падрыўніком. Ажыццяўляў дыверсіі на чыгунках ля Варапаева Пастаўскага раёна. Каля вёскі Язна Міёрскага раёна ўдзельнічаў у баях з немцамі. Вясной 1944 года пачалася карная экспедыцыя немцаў супраць партызан. Атраду быў дадзены загад перайсці ў Каз'янскія лясы. Немцы лютавалі: напярэдадні наступлення Чырвонай Арміі яны хацелі ачысціць свой тыл ад партызан. Партызаны, адступаючы, панеслі вялікія страты. З атрада дайшло толькі 12 чалавек, пашанцавала і Сцяпану Рыгоравічу. Прыйшоўшы на месца, байцы ўбачылі спаленыя карнікамі вёскі.

Там у 1944 годзе партызаны злучыліся з Чырвонай Арміяй. Дзень Перамогі Сцяпан Рыгоравіч сустрэў у Літве.

**Мішута Іван Данілавіч**

Нарадзіўся ў 1923 годзе. У партызаны пайшоў у сакавіку 1944 года. Працаваў падрыўніком. Прымаў удзел ў знішчэнні лініі сувязі Дзісна – Шаркаўшчына. У Германавічах Шаркаўшчынскага раёна партызаны спрабавалі ўзарваць мост, але не ўдалося. Часта даводзілася хадзіць у разведку. У час блакады трапіў у палон на балотах. Партызаны зарываліся пад мох. Нямецкія самалёты лёталі так нізка, што ветрам падымала мох. Ворагі прачэсвалі лес і балота ў шахматным парадку з сабакамі, каб ніводзін кавалачак зямлі не застаўся неправераным. У такіх умовах схавацца было амаль немагчыма. Так Іван трапіў у палон, а адтуль у нарвежскі канцлагер. Цярпеў самыя жудасныя здзекі, голад, важыў малады і некалі крэпкі юнак каля 42 кілаграмаў. Дзень Перамогі сустрэў толькі 10 мая 1945 года, калі вызвалілі англічане (немцы ўпарта не хацелі верыць у капітуляцыю). Потым быў адпраўлены ў фільтрацыйны лагер, дзе праходзіў праверку. Адтуль выправілі ў Маскоўскую вобласць у Новафамінск на лесанарыхтоўкі. Быў адпушчаны толькі ў 1947 годзе.

**Краська Мікалай Феакціставіч**

На фронт Мікалай трапіў у 1941 годзе. Пад Віцебскам трапіў у акружэнне. Палонных вывезлі ў лагер пад Лепель. Адтуль удалося збегчы дадому.

У 1943 годзе пайшоў у партызаны ў 4-ую Беларускую партызанскую брыгаду ў атрад Канапелькі. Быў разведчыкам. Жонка Мікалая пякла хлеб для партызан. З пачаткам блакады ў 1944 годзе патрэбна было спешна перабрацца ў Каз'янскія лясы, але партызаны трапілі ў акружэнне, чацвёра схавалася ля возера Ельня, у тым ліку і Мікалай Феакціставіч. Ноччу вярнуліся дадому і адразу пайшлі ў Плісу, дзе і сустрэліся з атрадамі Чырвонай Арміі.

Спачатку накіравалі ў горад Маладзечна, а потым ў горад Горкі, дзе вучыўся на курсах шафёра, там і сустрэў Дзень Перамогі. Пасля заканчэння курсаў быў накіраваны на Далёкаўсходні фронт у горад Нованікольск каля Уладзівастока. *5 жніўня 1945 г. Стаўка ВГК перайменавала Далёкаўсходні фронт – у 2-і Далёкаўсходні. Групіроўка Савецкіх Узброіных Сіл на Далёкім Усходзе ўяўляла сабой сілу, здольную зламаць у кароткі тэрмін японскае супраціўленне ў Маньчжурыі. Аснову яе складалі салдаты і афіцэры злучэнняў і часцей, якія ў час вайны знаходзіліся на Далёкім Усходзе, былі добра абучаны ў ходзе працяглай баявой падрыхтоўкі і ведаўшыя тэатр ваенных дзеянняў, характар абароны праціўніка і асаблівасці японскай арміі. Камандуючым 2-ім Далёкаўсходнім фронтам быў генерал М. А. Пуркаеў. Працягласць фронта дасягала 2130 км*[9 ].

2 верасня была аб'яўлена капітуляцыя Японіі, але ў арміі працягваў служыць да 1946 года.

### Сядлоўскі Мікалай Сямёнавіч

Нарадзіўся ў 1926 годзе ў беднай малазямельнай сям'і. Восенню 1942 года з'явіліся партызаны. Гэта быў атрад пад камандваннем Карабкова. Мікалаю ў той час было 16 гадоў. Ён быў рослым хлопцам, развітым. Юнака цягнула да партызан. Неўзабаве ён пасябраваў з некаторымі з іх. Пасля выканання некалькіх партызанскіх даручэнняў камандзір атрада Карабкоў прапанаваў юнаку ўступіць у атрад. Мікалай згадзіўся. Пачалося партызанскае жыццё, якое выпрабоўвала юнака, бо цяпер ён падвяргаўся смяротнай небяспецы.

У 1943 годзе атраду давялося змяніць месца дыслакацыі. Перабраліся на тэрыторыю Шаркаўшчынскага раёна, у вёску Дзікева. Перад атрадам паўстала задача не дапускаць немцаў і паліцаяў у партызанскую зону, не даваць ім магчымасці рабаваць насельніцтва, забіраць моладзь на прымусовыя работы. Час ад часу партызаны аб'яднанымі сіламі трывожылі нямецкія гарнізоны. У маі 1944 года пачалася блакада. Сілы былі няроўныя. Немцы кінулі супраць партызан рэгулярныя часці і карныя каманды, якія падтрымліваліся артылерыяй і некалькімі самалётамі-разведчыкамі. Партызаны адступалі. Камандванню патрабаваліся звесткі пра праціўніка. Важна было правільна вызначыць месца для прарыву блакаднага кальца. Мікалаю Сядлоўскаму , які добра ведаў мясцовасць, і яшчэ чатыром партызанам было даручана правесці разведку і ўстанавіць, якімі сіламі вядуць наступленне немцы з боку Германавіч. Падышлі да хутара, размясціліся для назірання. Не паспелі зайсці ў дом, як партызан нехта аклікнуў з сухой ліпіны. Партызаны насцярожыліся, бо ведалі, што ў гэтай мясцовасці іншых партызан не павінна быць. Рэакцыя іх была правільнай, бо заўважылі паліцаяў. Мікалай імгненна ўскінуў вінтоўку і стрэліў у паліцая, які знаходзіўся на ліпіне. Разведчыкі з усіх ног кінуліся да лесу. Па іх адкрылі ўраганны агонь. Пагоню не наладзілі, і партызаны паспяхова дабраліся ў свой атрад.

Хутка атрымалі новае заданне – звязацца з 4-й Беларускай партызанскай брыгадай. Мікалай ведаў, што чацвёрты яе атрад знаходзіўся ў вёсцы Баркоўшчына. Родная вёска Мікалая Залессе была побач з Баркоўшчынай. Не паспелі падысці да дома Мікалая, як яго сястра папярэдзіла, што ў Баркоўшчыне ўжо немцы. Вось-вось з'явяцца тут. Партызаны вымушаны былі

пайсці да возера Ельня, а потым да месца дыслакацыі атрада. Яго там ужо не аказалася, пайшоў на прарыў. Разведчыкі кінуліся ўслед і цудам выбраліся з кальца блакады ў тым месцы, дзе немцы не паспелі паставіць заслон. Лясамі і пералескамі накіраваліся ў Каз'яны. Даводзілася абыходзіць вёскі і дарогі. З атрадам злучыліся напярэдадні прыходу Чырвонай Арміі.

У лясах засталіся паліцаі і тыя, хто супрацоўнічаў з немцамі. Сітуацыя была складанай. Гінулі актывісты, учасціліся рабаўніцтвы. Для барацьбы з бандытамі ствараецца знішчальны атрад, у склад якога бяруць мясцовых людзей. Мікалая таксама залічылі ў такі атрад, але неўзабаве ён атрымаў новае заданне. Праводзілася мабілізацыя мясцовага насельніцтва ў Чырвоную Армію. Каманды прызыўнікоў з райваенкамата пешшу трэба было дастаўляць на зборны пункт у Курынец. Мікалай шэсць разоў суправаджаў такія каманды. Здаралася, што ноччу хтосьці ўцякаў. Настаў час і самому Мікалаю ўліцца ў рады Чырвонай Арміі. Курс маладога байца прайшоў у Баравусе, што ля Полацка. Пасля гэтага чыгуначны састаў даставіў яго ў Львоў. У Львове атрымаў назначэнне ў стралковы полк. З улікам добрых фізічных дадзеных і як меткага стралка юнака прызначылі першым нумарам станкавага кулямёта "Максім".

Запомніўся на ўсё жыццё цяжкі бой у Польшчы ў раёне горада Бела Падляска. Атрымалася так, што полк уклініўся ў абарону праціўніка. Немцы, каб выраўняць свае пазіцыі, пайшлі ў контратаку. Кулямётчыкі не адпачывалі. Вада ў кулямётным кожуху закіпала. Мікалай не заўважаў, што нямецкія кулямётчыкі бяруць яго ў "вілку". І каб не камандзір роты, які рэзкім рыўком зваліў Мікалая ў траншэю, не мінаваць бяды. Наступныя разрывы мін адбыліся побач з кулямётам. Асколкамі секанула па нагах. Дзень Перамогі салдат сустракаў у шпіталі ў Камянец-Падольску. Адтуль ён цераз некалькі месяцаў і быў дэмабілізаваны. У жніўні 1945 года Мікалай Сямёнавіч прыбыў дамоў.

## 1.3. Жанчына на вайне

Няма такой падзеі ў гісторыі нашай Радзімы, куды б жанчына не ўклала сваю працу, свой розум, сваю мужнасць. Здольнасць жанчыны імкнуцца туды, дзе цяжка, асабліва ярка праявілася ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
У гэтыя невыносна цяжкія для краіны дні жанчыны разам з мужчынамі падзялілі ўвесь цяжар барацьбы з фашызмам, змагаліся супраць ворага ў партызанскіх атрадах, на фронце, у тыле і падполлі.

### Мішута Марыя Сцяпанаўна
### (дзявочае прозвішча Мядзелец)

…Калі пачалася вайна, мне было 19 гадоў. У сям'і было чацвёра братоў, я, маці і бацька. Калі немцы панаехалі ў вёску, то ўсе жыхары схаваліся на балоце. Ворагі акружылі балота, уцячы змаглі толькі некаторыя. У ліку гэтых людзей была і наша сям'я. Пасля гэтага мае браты Даніла, Пётр і Міхаіл пайшлі на фронт, а я пайшла ў партызаны. Спачатку была разведчыцай, потым сувязісткай. У нашай групе было 12 чалавек, з іх 8 дзяўчат і 4 хлопцы. Гэта была падпольная камсамольская арганізацыя. Хадзіла пешшу ў Дзісну, Лужкі, Глыбокае, Язна, збірала звесткі для партызан. Рызыка была вялікая. Кожны раз

патрэбна было прыдумваць “легенду”, бо немцы дапытваліся ў бацькоў, дзе я. Заўсёды былі напагатове, не начавалі ў хаце.

Пасля блакады і вызвалення Беларусі я працавала ў Турчанскім сельсавеце, а пасля мяне адправілі вучыцца на курсы медсясцёр, каб адправіць на фронт. Там я і сустрэла Дзень Перамогі. У медыцыне адпрацавала 38 гадоў.

**“Шлюбнае” падарожжа**
**Федарэц Мікалай Васільевіч**

Мікалай Васільевіч Федарэц пайшоў на фронт у 1941 годзе праз два месяцы пасля вяселля. І больш не вярнуўся… Толькі два месяцы працягвалася яго сямейнае жыццё. Так і не даведаўся Мікалай Васільевіч, што 10 лютага 1942 года ў яго нарадзіўся сын Мікола. За ўвесь час ён не прыслаў дадому ніводнага пісьма. Чаму? Невядома. Адзінае, што прыйшло ад яго – гэта паштовая картка, у якой ён паведамляе, што жывы і здаровы, што ўжо спыніўся на месцы ў мястэчку Зельва ля Баранавіч, што ёсць адзенне і хапае есці. Перадае паклон дарагой жонцы (пра сына не ведае), піша, што вельмі смуткуе і высылае паштоўку, у якой указвае адрас. Невядома, ці атрымаў Мікалай адказ, які паслалі жонка і бацька на дадзены адрас. У верасні 1944 Федарэц Мікалай Васільевіч прапаў без вестак. Яго аднавясковец, Фёдар Іванавіч Мяцеліца, які служыў з ім у адной роце, расказваў, што ў лесе, дзе яны спыніліся, пачалася бамбёжка. Нямецкія самалёты наляцелі знянацку, салдаты і камандзіры гэтага не чакалі. Агонь, выбухі, смерць… Магчыма, там Мікалай і загінуў. Крыху не дачакаўся ён 9 мая 1945 года. Не падкідваў шапку ў неба, не страляў святочны залп з вінтоўкі, не ведаў, што сын  будзе расці на мірнай зямлі, бо яго бацька аддаў за гэта жыццё.  Вайна забрала ў бацькі сына, а ў сына – бацьку. Вечная памяць героям, паўшым у баях за Радзіму!

Лёс Мікалая Васільевіча раздзялілі многія нашы землякі. Помнікі, абеліскі, пахаванні – гэта маўклівыя сведкі вайны. Вечная памяць героям, якія набліжалі Вялікую Перамогу.

## 1.4. На працоўным фронце

…Вайна тым ці іншым шляхам увайшла ў кожную сям’ю: нехта змагаўся на фронце, у  радах партызанаў, а хтосьці праявіў небывалую працоўную стойкасць у тыле. Іх жыццё і праца былі падначалены аднаму святому абавязку: “Усё для фронта, усё для Перамогі!”. Несумненна, што на слаўных справах ветэранаў вайны і працаўнікоў тылу павінны выхоўвацца новыя пакаленні, вучыцца мужнасці, адвазе і стойкасці.

**Федарэц Аляксандр Васільевіч**

Аляксандра прызвалі ў армію ў 1940 годзе. Яго адправілі ў горад Чугуеў Харкаўскай вобласці, там ён і праходзіў тэрміновую службу. У пачатку вайны хлопца паслалі пад Вільню. Па дарозе іх пачалі бамбіць нямецкія самалёты. Першы раз у жыцці Аляксандру прыйшлося хаваць чалавека – свайго таварыша, які загінуў у час нямецкага абстрэлу. Тады прыйшоў загад адпраўляцца ў Свярдлоўск: там трэба было перабудаваць завод пад ваенныя патрэбы. Так ён трапіў на Ўралхіммашбудаўнічы завод, які працаваў пад адкрытым небам у лесе. Прыходзілася вельмі многа працаваць і мала

адпачываць. Пайкі былі слабымі, таму голад быў частым госцем. Жылі ў дашчатых бараках. Зразумела, што зімой там было вельмі халодна. Многія, у тым ліку і Аляксандр, памаразілі ногі. Завод будавалі грамадзяне каля 30 нацыянальнасцей. Тут выраблялі і танкі, і снарады. Завод да канца вайны даваў вялікую норму – 27 танкаў  у суткі(!). Потым Аляксандр вывучыўся на шафёра, і стала лягчэй працаваць. Падвозіў гравій, цэмент. Працаваў на заводзе і пасля вайны. Яго бацькі, якія засталіся ў вёсцы, выбралі даведку аб вельмі цяжкім становішчы (адзін сын не вярнуўся з вайны, а другі працуе на заводзе). Пасля гэтага Аляксандра Васільевіча адпусцілі дадому.

## 1.5. Вязні канцлагера

Некаторыя нашы землякі сустрэлі Дзень Перамогі ў канцлагеры. Гэта вельмі жудасна. Вось яна … Перамога. Перамога, да якой вялі доўгія пакутныя месяцы, секунды, якія здаваліся гадзінамі. А ты не можаш раздзяліць гэтую радасць, ты не ведаеш, што цябе чакае.  Наканавана табе загінуць ад голаду, хваробы ці  згарэць у крэматорыі. Загінуць, так і не ўбачыўшы родную зямлю і змучаныя, але шчаслівыя твары землякоў. Людзі, якія воляю лёсу аказаліся ў канцлагеры, цярпелі страшныя прыніжэнні і  здзекі. У іх не было вінтовак у руках, каб пастаяць за сябе, не было акопаў, а тым больш самалётаў і танкаў. У іх было толькі вялікае жаданне выжыць. Выжыць, каб убачыць блізкіх людзей, Радзіму, мірнае неба…

### Мікалай Уладзіміравіч Чарняўскі
### Яго лагерны нумар 25890

Мікалай Уладзіміравіч Чарняўскі нарадзіўся ў далёкім 1927 годзе. Сям’я жыла бедна, зямлі было мала. Таму ўжо пры акупацыі аддалі Міколу ва ўслужэнне багатаму селяніну пасвіць кароў і авечак. У 1942 годзе ў лясах вакол Яльнянскага балота з’явіліся партызаны. З надыходам вясны 1944 года фашысты распачалі карную экспедыцыю супраць партызанскіх злучэнняў. Пацярпелі ад карнікаў і мірныя жыхары. Шмат моладзі тады вывезлі ў Германію, забралі і Мікалая Чарняўскага, яму ішоў тады 17-ы год. Спачатку затрыманыя  трапілі пад Дрысу (сучаны г.Верхнядзвінск).  Тут іх прымусілі капаць акопы, выконваць іншыя абарончыя работы: немцы чакалі наступленне Чырвонай Арміі з-пад Віцебска і Невеля. Праз два тыдні вязняў упіхнулі ў таварныя вагоны і павезлі ў Нямеччыну. У горадзе Флосенбюрг пешшу скіравалі да канцлагера. З пачатку вайны праца большай часткі вязняў выкарыстоўвалася для вырабу зброі. Большасць палонных паступала ў лагер з акупіраваных усходніх тэрыторый. Вязні жылі ў 16 бараках на тэрыторыі лагера. Крэматорый размяшчаўся ў лагчыне. У 1945 годзе ў сістэме лагераў Флосенбюрга налічвалася каля 40000 палонных, 11000 з якіх складалі жанчыны. Над уваходам у канцлагер вісела аб’ява: “Выхад толькі праз трубу крэматорыя”[9].

Там людзей апранулі ў паласатыя халаты, кожнаму прысвоілі нумар. Мікалаю Чарняўскаму нумар 25890 замяніў і імя, і прозвішча. Многія паміралі з голаду. Крэматорый дзейнічаў пастаянна. Штодзень каманду вязняў накіроўвалі на авіяцыйны завод, які месціўся ў нетрах скалістай гары. На заводзе Мікалай развінчваў часткі разбітых самалётаў, выбіраў цэлыя дэталі,

якія маглі быць выкарыстаны пры зборцы новых. Завод лічыўся сакрэтным аб’ектам, а таму вязні канцлагера рана ці позна павінны былі сакрэты забраць з сабой у магілу. І аб тым яны добра ведалі. А тым часам Чырвоная Армія пачала штурм Берліна.

Аднойчы на досвітку калону вязняў пастроілі і павялі не да завода, а ў напрамку гор. Суправаджалі калону пажылыя немцы, бо маладыя былі на фронце. Неўзабаве звярнулі на паляну, і калі аб’явілі прывал – адбылося нечаканае. На кожнага канваіра адначасова накінулася па некалькі маладых вязняў. Не прагучаў ні адзін стрэл, зброя перайшла ў рукі паўстаўшых. А канваіраў задушылі голымі рукамі. Падпольны камітэт вязняў загадзя вылучыў групы нападу на канвой, якія раўнамерна занялі месцы па краях калоны. Таму ўсё адбылося так арганізавана.

Нейкі час былыя зняволеныя хаваліся ў гарах, галадалі. Свабоду ім прынеслі амерыканцы, прывезлі прадукты харчавання. Многія памерлі ад пераядання. Паўтара месяца знаходзіліся ў амерыканскай зоне, а потым савецкіх грамадзян 15 чэрвеня 1945 года перадалі Чырвонай Арміі. Яны прайшлі пільную праверку органаў бяспекі. Мікалая Чарняўскага таксама некалькі разоў выклікалі на допыты. Ён заўсёды гаварыў толькі праўду: у партызанах не быў, але і немцам не служыў. І яму паверылі. А таму ў жніўні ён быў ужо дома. Мясцовыя органы бяспекі ажыццявілі сваю праверку, якая пацвердзіла, што Мікалай сапраўды пацярпеў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

## Міхаіл Раманавіч Белазорчык
## Самы памятны дзень

Міхаілу Раманавічу запомнілася менавіта 9 мая 1945 года ў далёкім славенскім гарадку Храстнік.

У 1944 годзе Міхаілу Белазорчыку ішоў 16-ы год. Звычайны сялянскі хлопец з вёскі Лугаўцы. Займаўся прывычнымі земляробчымі справамі. Вось толькі жыў ён у партызанскай зоне, граніца якой праходзіла зусім побач, па Дзісёнцы. Таму, калі пачалася карная экспедыцыя супраць народных мсціўцаў, карнікі аказаліся тут хутка. Яны сабралі ўсіх мужчын, ад юнакоў да старых, і пагналі пешшу ў Дзісну. Потым усіх з месяц выкарыстоўвалі ў якасці рабочай сілы на будаўніцтве ўмацаванняў ля Боркавічаў, Зялькоў, Владычына. Непакоіліся захопнікі, бо Чырвоная Армія наступала. З натоўпам аднавяскоўцаў і суседзяў босым дайшоў Міхаіл Белазорчык да Даўгаўпілса. Больш пашанцавала яго бацьку, якога пасадзілі на машыну, што падарвалася на партызанскай міне, а таму змог схавацца і праз нейкі час вярнуўся дадому. А сына давезлі поездам да Рыгі, потым яшчэ месяц паўгалоднага вазілі ўзад-уперад ледзь не па ўсёй Еўропе. Як такое магло здарыцца пры нямецкай дакладнасці? Цяпер у Міхаіла Раманавіча тлумачэнне адно: канваіры не хацелі трапіць на фронт, а таму і адцягвалі адпраўку як маглі. Вось і аказаўся ён у канцлагеры ў Вене. Калі ёсць праца – хоць крышку пакормяць, няма – ляжы на халодным бетоне галодным. Наступны канцлагер быў ля Зальцбурга між гор з вечнымі снягамі. Рабілі пляцоўкі для падвясных канатных дарог. Менавіта на такіх узнімаюцца на вышыню сучасныя турысты-лыжнікі. Працавалі побач з ваеннапалоннымі. Разам гінулі пад снежнымі лавінамі і ад цяжкай працы, разам галадалі – у выходныя дні давалі толькі чай.

Пасля Новага года апынуўся Міхаіл у Югаславіі на вугальных шахтах. І тут цяжкая і небяспечная праца ў тры змены. Ноччу, калі пільнасць варты прытуплялася, многія зняволеныя па запасных лесвіцах узнімаліся на паверхню і ўцякалі ў горы да партызан. У канцы красавіка 1945 года гэтым шляхам пайшоў і Міхаіл. Пашанцавала. Хутка разам з іншымі ўцекачамі напаткаў партызанскую разведку. Адпачываў і ад'ядаўся на кухні, рыхтуючы дровы.
8 мая партызаны ўвайшлі ў Храстнік, а на наступны дзень і было тое запамінальнае свята Перамогі. Адбывалася яно на плошчы ля царквы. І мора кветак. Шлях дадому быў не просты. Яшчэ месяцы два адпрацаваў на шахце, дзе не хапала рабочых рук. Праўда, цяпер ужо не пад зямлёй. Потым з даведкай, выдадзенай югаслаўскімі партызанамі, даехаў у аўстрыйскі горад Грац, дзе знайшоў рускіх. Тут быў фільтрацыйны лагер. Тут рыхтавалі дакументы для вяртання на Радзіму. Доўгачаканая сустрэча з роднымі адбылася толькі восенню пераможнага года. Але найбольш запомніўся Міхаілу Раманавічу ўсё ж Дзень Перамогі. Гэта і цяпер самае радаснае свята.

## 1.6. З успамінаў мясцовых жыхароў

Страшна слухаць успаміны франтавікоў, партызанаў, падпольшчыкаў. А як было ім, простым безабаронным людзям, якіх за нішто білі, расстрэльвалі, палілі. Яны таксама прыбліжалі Перамогу: кармілі, апраналі, абагравалі партызан, хавалі палонных, збіралі звесткі пра немцаў. Прайшлі дзесяцігоддзі, а людзі, якія перажылі вайну, памятаюць шчаслівы момант вызвалення, быццам гэта было ўчора, і моляць аб адным, каб больш не было вайны…

### З успамінаў Рэгіны Антонаўны Асоцкай

…Дні, калі была вызвалена наша мясцовасць ад немцаў, я памятаю добра. Вельмі страшна было. Немцы адступалі ад Дзісны, былі за Дзвіной у лясах. Гавораць, што там былі пабудаваны нават вышкі, каб лепш было назіраць за нашай мясцовасцю. Вялі адтуль абстрэл з мінамётаў і пушак. Было вельмі страшна, у хатах баяліся сядзець. Наша хата стаяла блізка ад лесу, але нават да яе даляталі міны і снарады. Многія людзі пакінулі вёску. Я таксама пайшла ў Бяляны да сваякоў. Але дайсці не паспела, сустрэла савецкіх салдат. Столькі было радасці, што, памятаю, голасам галасіла! Дадому вярнулася – усюды нашы салдаты. Былі яны вельмі змораныя, а яшчэ цягнулі пушкі. Каб было лягчэй, забралі коней. Мы ўсё апошняе аддавалі з радасцю, стараліся іх і накарміць, і абмыць. У нашай вёсцы салдаты стаялі чатыры дні. У нашай хаце было трое, потым яшчэ прыйшлі салдаты з фронту. А потым была цішыня… Мы спалі некалькі дзён запар, бо перад гэтым былі заўсёды у страху і напружанні. Днём – немцы, ноччу – партызаны. Прыслухоўваліся да кожнага гуку: ці не загудуць матацыклы, ці не затрашчаць аўтаматы. Кожны дзень прыходзілі чуткі: таго забралі, таго забілі. Страшна было… Асабліва было страшна ў час блакады. Немцы праводзілі экспедыцыі па знішчэнні партызан. Яны ішлі ланцугом каля нашай хаты і абстрэльвалі яе, мы схаваліся за печчу. Цяпер дзіўна, як тады ўцалелі? Многа людзей загінула на балоце (пасля вайны часта знаходзілі трупы, косці, адзенне, рэчы).

Столькі было страху, а тут такая цішыня… Не верылася, што выжылі. Не дай Бог перажыць яшчэ раз вайну!

**Заключэнне**

Сучасная Беларусь з’яўляецца адной з самых талерантных і міралюбівых краін у свеце. Мы – за мір! Мы – за шчаслівую будучыню! Наша зямля зведала разбуральную сілу вайны. Мемарыяльныя комплексы, мноства помнікаў і абеліскаў напамінаюць аб тым, наколькі жудаснай і бесчалавечнай была тая вайна. Перамогу здабывалі ў няроўнай барацьбе. Час ідзе, адыходзяць непасрэдныя сведкі тых славутых і трагічных падзей. Новыя пакаленні будуць ведаць пра тую вайну ўжо не па расказах бацькоў, дзядоў і бабуль, а толькі з кніг. Як жа яны будуць уяўляць яе?

Цяпер, у мірны час, калі жыццю нічога не пагражае, людзі часта губляюць маральнае аблічча: ужываюць наркотыкі, алкаголь, моладзь брыдкасловіць, грубіяніць, знікаюць многія маральныя ідэалы. Усё складаней дастукацца да сэрца сучаснага маладога чалавека. У такі час важна паказаць, што мірнае неба над галавой і кавалак хлеба на стале – гэта не бескарысны падарунак лёсу, гэта заслуга тых, хто ніколі не вернецца з поля бою, тых, хто пакінуў сваю маладосць на фронце, тых, хто ахвяраваў сваім здароўем, тых, хто згубіў блізкіх і родных, каханне на вайне. Хочацца спытаць, а ці маглі б мы сёння вытрымаць такую вайну, ці перамаглі б такога ворага? Цяжка адказаць, бо нам, хто не бачыў вайны, страшна нават чытаць і слухаць успаміны ветэранаў. Уявіце сабе, як ім было там, у самым пекле!

Трэба памятаць пра тых, хто аддаў сваё жыццё дзеля нашай будучыні! Давайце шанаваць тых, хто прыбліжаў вялікую Перамогу! Мы павінны быць удзячны тым людзям, якія змагаліся за вольнае і шчаслівае жыццё будучых пакаленняў. Яны, нашы бабулі і дзядулі, ветэраны і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, заслугоўваюць бязмернай павагі. Памятайце пра загінуўшых герояў, вывучайце гісторыю сваёй краіны.

Навекі слава тым, хто ў полі ратным
Загінулі за родныя палі,
За наш народ, за лёс народаў братніх,
За дзень наступны ўсяе зямлі!
Няпраўда, што засыпалі іх жвірам, –
Ім у стагоддзях вечна жыць і жыць.
Стаяць яны, як абаронцы міру,
На самым на пярэднім рубяжы.

Выкарыстаныя крыніцы:

1. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Міёрскага раёна. – Мн., Беларус. Навука, 1998. – 630 с.
2. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць/АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Рэд. кал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) і інш. – Мн.: Беларус. Сав. Энцыклапедыя, 1985.- 496 с.
3. Аляксандраў Л. Запомнілася свята//Сцяг працы. – 2000 г.
4. Высоцкі В. Яго лагерны нумар//Міёрскія навіны. – 2004 г.
5. Шымуковіч Ф. Усё жыццё – экзамен на сталасць//Міёрскія навіны. – 2004 г.
6. Матэрыялы школьнага гісторыка-этнаграфічнага музея “Сіцькова”.
7. Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т.2: Аршыца – Беларусцы/Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш.-Мн.:БелЭн, 1996.-460 с.
8. http://megabook.ru/artide
9. http://ru.wikipedia.org/wiki